## Тэма 3 ЭТАПЫ ВЫВУЧЭННЯ МАСТАЦКАГА ТВОРА Ў ШКОЛЕ

1 Спецыфіка правядзення ўступных заняткаў.
2 Чытанне твора і арыенціровачныя заняткі.
3 Аналіз як этап вывучэння літаратурнага твора.
4 Заключны этап вывучэння літаратурнага твора.

Незалежна ад колькасці ўрокаў, адведзеных на вывучэнне праграмнага твора, існуе пэўны чатырохэтапны парадак яго разгляду. Кожны з этапаў у залежнасці ад спецыфікі твора, колькасці гадзін, адведзеных на яго вывучэнне, узроставых асаблівасцей вучняў можа займаць ад некалькіх хвілін да цэлага ўрока, а этап аналізу – нават некалькі ўрокаў.

### 1 Спецыфіка правядзення ўступных заняткаў

Поспех вывучэння мастацкага твора ў школе не ў апошнюю чаргу залежыць ад падрыхтаванасці вучняў да яго ўспрымання. Таму першы этап вывучэння літаратурнага тэксту з'яўляецца надзвычай важным на ўроку.

**Мэты**:

- стварыць адпаведны характару матэрыялу эмацыянальны настрой;
- падрыхтаваць вучняў да правільнага і глыбокага ўспрымання ідэйнага зместу твора;
- стварыць устаноўку на чытанне тэксту;
- выклікаць цікавасць да аўтара і яго твора;
- мабілізаваць увагу;
- забяспечыць узаемасувязь тэмы з вядомай раней інфармацыяй.

Калі на ўступным этапе акрамя стварэння зацікаўленасці будзе пазнавальны матэрыял, то патрэбна абавязкова праверыць яго засваенне вучнямі на этапе замацавання. Абіраючы метады, прыёмы і формы работы, варта памятаць, што ўступны этап павінен быць лагічна звязаны з астатнімі, а не фармальна адкрываць работу па тэме. Тут не павінна быць выпадковых фактаў, якія не працуюць на дасягненне пастаўленых мэт (адукацыйнай, развіццёвай, выхаваўчай).

**Метады, прыёмы і формы работы**:

1) Гістарычны, гісторыка-бытавы, гісторыка-культурны каментар.

У праграме не так многа твораў, у якіх прыводзяцца знаёмыя вучням малюнкі і з'явы. Большасць праграмных тэкстаў апісвае мінулае, г. зн. паказвае незнаёмае дзецям жыццё. Так, толькі ў 6 класе настаўнік не зможа абысціся без гістарычнага каментару пры вывучэнні цэлага шэрагу твораў: У. Бутрамееў "Славутая дачка Полацкай зямлі" (Рагнеда), С. Тарасаў "Еўфрасіння Полацкая", Ф. Скарына "Біблія", "Цар Ірад", М. Сурначоў "У стоптаным жыце" і інш. Гістарычны каментар павінен маляўніча, эмацыянальна, белетрызавана, а не ў навуковым стылі прадставіць эпоху, якая апісваецца ў творы. Часам неабходны і гісторыка-культурны каментар. Да прыкладу, няведанне біблейскіх легенд перашкодзіць адэкватнаму ўспрыманню твораў "Страцім-лебедзь", "Апокрыф" М. Багдановіча ці ўжо названых "Бібліі" Ф. Скарыны, "Цар Ірад"; антычнай міфалогіі – твораў "Энеіда навыварат", "Тарас на Парнасе"; апошні з іх патрабуе і каментару пра асаблівасці літаратурнай барацьбы 50–60-х гг. 19 стагоддзя супраць "афіцыйнай народнасці" і г. д.

2) Біяграфічная даведка.

Яна карысная найперш пры вывучэнні твораў з элементамі *аўтабіяграфізму*. Змест біяграфічнай даведкі, у адрозненне ад урокаў вывучэння жыццёвага і творчага шляху пісьменніка, даволі абмежаваны.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

3) Гісторыя напісання твора.

Такіх звестак патрабуюць многія творы, да прыкладу, “Курган” Я. Купалы, “Палеская хроніка” І. Мележа. Зварот да гісторыі стварэння твора дазваляе пазнаёміць з аўтарскай задумай, раскрыць прычыны, якія прывялі да напісання твора, “ажывіць” вобраз пісьменніка.

4) Гісторыка-літаратурнае параўнанне, якое дазваляюе ўвесці ў тэматыку твора, упісаць яго ў нацыянальны ці сусветны кантэкст.

5) Тэарэтычная даведка на ўступным этапе неабходна ў тым выпадку, калі без звестак па тэорыі літаратуры вучні не здолеюць адэкватна ўспрыняць твор. Да прыкладу, паняцце “травесційна-бурлескная літаратура” пры вывучэнні паэм “Энеіда навыварат” і “Тарас на Парнасе”.

6) Лексічная даведка.

Слоўнікавая работа праводзіцца на розных этапах вывучэння мастацкага твора (а можа выкарыстоўвацца некалькі разоў на ўроку) і, адпаведна, мае розныя задачы. На ўступным этапе яна прадугледжвае невялікую колькасць незразумелых слоў: толькі тых, няведанне якіх перашкодзіць паўнавартаснаму ўспрыманню твора. Да прыкладу, “касачы” пры вывучэнні твора П. Панчанкі “Сінія касачы”.

7) Ілюстрацыйны і дэманстрацыйны метады дазваляюць стварыць неабходны настрой на ўступным этапе, наглядную апору для гістарычнага каментару, паказаць партрэт пісьменніка, урыўкі з фільма ці спектакля па творы і інш.

8) Уступнае слова настаўніка, галоўнае патрабаванне да якога – эмацыянальнасць.

9) Уступная гутарка, матэрыял, звязаны з жыццёвым вопытам вучняў, іх асабістымі ўражаннямі. Выкарыстоўваецца, калі матэрыял часткова знаёмы дзецям з ранейшых урокаў літаратуры ці іншых крыніц. Гэта пейзажныя творы, творы пра школьнае жыццё, казкі, творы знаёмага пісьменніка і інш. Мэта: выклікаць патрэбныя асацыяцыі, развіваць мову вучняў.

10) Экскурсія. Экскурсіі ў музей ВАВ ці па месцы ваенных падзей можна наладзіць экскурсію перад вывучэннем творчасці В. Быкава ці “Рэквіема па кожным чацвёртым” А. Вярцінскага, у краязнаўчы музей – перад вывучэннем твораў на экалагічную тэматыку (І. Ташнікаў “Алені”, А. Жук “Стары бабёр”, П. Панчанка “Сармацкае кадзіла” – 6 клас), у музей Чарнобыля. Экскурсіі ў прыроду дапамогуць накапіць матэрыял для вывучэння пейзажнай лірыкі. Галоўнае – мінімальны адцінак часу паміж экскурсіяй і самім урокам. Экскурсія можа быць і завочнай (памятныя месцы, звязаныя з пісьменнікам). Велізарная роля належыць прафесійна падабранаму візуальнаму раду і эмацыйнасці выкладу.

12) Самастойная творчая работа вучняў. Такая форма работы выкарыстоўваецца нячаста, бо займае шмат часу на ўроку. Аднак карысным будзе прапанаваць вучням напісаць сачыненне-мініяцюру па выніках назірання прыроды ў пэўную пару года. Пасля ўласнай спробы творчасці дзецям прасцей бывае зразумець, што ў кожнага паэта сваё бачанне зімы.

13) Каменціраванае чытанне ўступных артыкулаў, работа з падручнікам.

14) Паведамленні ў форме апераджальных заданняў.

15) Пастаноўка праблемнага пытання, стварэнне праблемнай сітуацыі; каментар эпіграфа да ўрока.

Найбольш распаўсюджаныя **памылкі** ў правядзенні ўступных заняткаў:

А) адсутнасць творчага падыходу, выкарыстанне стэрэатыпу;

Б) адсутнасць арганічнай сувязі паміж уступным этапам, самім творам і сістэмай урокаў па яго вывучэнні;

В) злоўжыванне звесткамі з гісторыі і сацыялогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## 2 Чытанне твора і арыенціровачныя заняткі

Ад якасці першаснага чытання твора залежыць сіла яго ўздзеяння на вучняў, таму ў сярэднім звяне (а лірыкі – і ў старэйшых класах) яно ажыццяўляецца настаўнікам, які павінен бездакорна валодаць тэхнікай выразнага чытання. Пры вывучэнні эпічнага і драматычнага твора пад час чытання настаўніка вучні павінны сачыць па кнізе, пры вывучэнні лірыкі – слухаць з закрытымі падручнікамі. Творы буйной і сярэдняй эпічнай формы патрабуюць папярэдняга самастойнага дамашняга чытання вучнямі. Таму адной з першаступенных задач настаўніка на гэтым этапе становіцца задача “прымусіць” вучня прачытаць тэкст.

Работа над новай тэмай пачынаецца са стварэння станоўчай матывацыі да чытання праграмных тэкстаў (прычым метадысты настойліва раяць прывучаць дзяцей да чытання тэкстаў у поўным аб’ёме, а не хрэстаматыйных урыўкаў і тым больш не сурагатных пераказаў). Трэба заўважыць, што і сёння няма універсальных, адназначна эфектыўных спосабаў для заахвочвання дзяцей да чытання. Прапануем найбольш дзейсныя.

**Прыёмы, якія фарміруюць інтарэс да твора**:

- ✓ “калаж”: выбарачнае чытанне найбольш яскравых эпізодаў, спалучанае з каментарам, чаму выбраны менавіта гэтыя ўрыўкі;
- ✓ “рэклама”: чытанне па прынцыпу “працяг будзе”, вострасюжэтныя ўрыўкі, чытанне якіх абрываецца на кульмінацыі;
- ✓ выставы кніг аўтара ці прысвечаных яму з зачытваннем найбольш цікавых, вострых і палемічных цытат;
- ✓ расповед пра цікавыя і трагічныя старонкі жыцця пісьменніка;
- ✓ прагляд і абмеркаванне ўрыўкаў кінаэкранізацый ці пастановак твора;
- ✓ чытанне сучасных твораў, сугучных класічнай літаратуры;
- ✓ арганізацыя сістэмы “пяціхвілінак”, на якіх правяраецца, як і што чытаюць вучні;
- ✓ паведамленне-расповед вучня, які ўжо прачытаў твор.

Але ёсць і такая частка дзяцей, для якіх чытанне – пакута. Прымусіць іх чытаць даволі складана. Менавіта для такіх вучняў можна прапанаваць індывідуальныя апераджальныя заданні факталагічнага характару, хаця ў цэлым методыка не рэкамендуе даваць такія заданні вучням пры першасным самастойным чытанні эпічнага тэксту. І гэта справядліва: “Такі прыём, - піша вядомы метадыст В. Галубкоў, - …ідзе ў разрэз з элементарнымі патрабаваннямі псіхалогіі ўспрымання чытача”.

Пасля першаснага чытання неабходна арганізаваць работу па вывучэнні ўспрымання твора, што ажыццяўляецца на арыентацыйным этапе. Перш чым пачынаць любую навучальную дзейнасць, трэба вытрымаць **паўзу**, каб не сапсаваць уражанне ад твора.

**Мэты арыенціровачнага этапа**:

1) выявіць сілу эмацыянальнай рэакцыі;
2) высветліць якасць засваення зместу твора;
3) падрыхтаваць вучняў да аналізу.

**Метады, прыёмы і формы работы**:

А) Рэпрадуктыўная гутарка фактуальнага і ацэначнага характару.
Б) Складанне плана і / ці сціслы пераказ.
В) Пісьмовая праца (водгук, эсэ).

Г) Праблемныя сітуацыі: чытанне кантрастных эпізодаў для ўвядзення ў цэнтральную праблему твора, увядзенне пазатэкставага матэрыялу (розныя пункты погляду крытыкаў).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Е) Віктарына па змесце твора.
Ж) Дыдактычныя гульні, тыпу "Пазнай героя па…", крыжаванкі.
З) Наглядны метад: прыцягненне сумежных відаў мастацтва і інш.

### 3 Аналіз як этап вывучэння літаратурнага твора

Самым важным і адказным этапам вывучэння мастацкага твора з'яўляецца яго аналіз. Недастатковая яго глыбіня прыводзіць не толькі да неадэкватнага ўспрымання тэксту, але і негатыўна адбіваецца на фарміраванні асобы вучняў: стрымлівае развіццё мовы і мыслення, урэшце прыводзіць да павярхоўных поглядаў на літаратуру. У сістэме заняткаў этап аналізу займае большую частку часу, чым усе астатнія разам (ад 20 хвілін да некалькіх урокаў). Гэта адзін з самых складаных відаў дзейнасці настаўніка, выпрабаванне яго на прафесійнасць.

**Школьны аналіз твора** – гэта разбор тэксту, які прыводзіць да паглыбленага яго прачытання і прадугледжвае пераход ад эмацыянальнага ўспрымання да паняційных і мастацкіх абагульненняў.

**Патрабаванні** да яго:
- мэтаскіраванасць;
- лагічнасць і паслядоўнасць;
- навуковасць: выкарыстанне тэарэтыка-літаратурных паняццяў як інструмента аналізу;
- выбар цэнтральнага аб'екта аналізу (**шляху аналізу**), але разгляд яго ва ўзаемасувязі з іншымі, у сістэме;
- улік узроставых асаблівасцей вучняў: дастатковая глыбіня і адбор матэрыялу;
- спалучэнне аб'ектыўнага данясення зместу твора з магчымасцю яго інтэрпрэтацыі;
- выхаваўчая накіраванасць.

*Агульнадыдактычныя мэты этапа аналізу:*

А) узбагаціць новымі ведамі;
Б) паглыбіць першапачатковае ўспрыняцце тэксту;
В) фарміраваць чытацкія ўменні (культуру чытання);
Г) выхоўваць асобу, садзейнічаць набыццю маральна-этычнага вопыту;
Д) развіваць мову, камунікатыўныя навыкі;
Е) развіваць творчыя здольнасці.

*Літаратуразнаўчыя мэты:*
- навучыць асэнсавана чытаць;
- вызначаць асноўныя элементы ідэйнага зместу і паэтыкі твора;
- умець аргументаваць сваю ацэнку прачытанага;
- бачыць аўтарскую пазіцыю, яго светапогляд і эстэтычныя ідэалы;
- асэнсаваць індывідуальнасць творчай манеры аўтара.

**Асноўныя аспекты аналізу мастацкага твора:**
- тэматыка;
- праблематыка;
- эмацыйны пафас;
- жанравая спецыфіка;
- сістэма мастацкіх вобразаў;
- сюжэт і асаблівасці пабудовы канфлікту;
- кампазіцыя: пейзаж, партрэт, дыялогі і маналогі, інтэр'ер, атмасфера дзеяння;
- моўныя і стылёвыя асаблівасці;
- вызначэнне ідэі твора (завяршае аналіз).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Аднолькавага і абавязковага парадку (за выключэннем вызначэння ідэі) для ўсіх твораў няма і быць не можа. Урокі, прысвечаныя аналізу мастацкага твора, досыць разнастайныя. Змест іх найперш залежыць ад абранага шляху аналізу.

**МПФ**: эўрыстычная гутарка, параўнанне, праблемныя сітуацыі, складанне характарыстыкі персанажаў, каменціраванае і выбарачнае чытанне, складанне плана, пераказ і інш.

У школьнай практыцы нярэдка бывае, што вывады з аналізу мастацкага твора і нават творчасці пісьменніка ў цэлым вельмі падобныя да вывадаў аб творы ці творчасці іншага пісьменніка. Гэта сведчыць пра фармальнасць і павярхоўнасць праведзенага аналізу.

## 4 Заключны этап вывучэння літаратурнага твора

Заключны этап служыць абагульненню і карэкцыі ведаў.

**Мэты**:

А) выпрацаваць погляд на твор у цэлым;

Б) фармуліроўка высноў;

В) рэалізацыя даследчых і творчых здольнасцей;

Г) паглыбленне ведаў шляхам увядзення дадатковай інфармацыі ці новых ракурсаў погляду на твор.

Заключныя заняткі павінны стварыць уражанне глыбіні і невычарпальнасці мастацкага твора. Скажам, праз параўнанне – надзвычай эфектыўны прыём на заключных занятках. Тут ён прадугледжвае супастаўленні не ўнутры вывучанага твора, а выходзячы за яго межы. Гэта можа быць супастаўленне герояў розных твораў з арсенала ўжо вядомых (і не толькі гэтага пісьменніка), што дазволіць наладзіць і якаснае паўтарэнне ведаў. Герояў для параўнання можна падбіраць па характарах, узроставай прыкмеце ці арыентавацца на тэматычнае падабенства пэўных тэкстаў гэтага аўатара ці іншага. Галоўнае не параўноўваць “быка з індыкам”. Важным становіцца і параўнанне жыццёвай асновы твора, прататыпаў з самім мастацкім тэкстам, літаратурны твор і яго экранізацыі і інш.

**Віды заключных заняткаў:**

1 Праблемныя. Прадугледжваюць стварэнне праблемнай сітуацыі ў пачатку ўрока і адшуканне шляхоў яе вырашэння (памятаем пра новы погляд на твор), 2-гі зварот да эпіграфа.

2 Паглыбляльныя. Накіраваны на больш поўнае разуменне характараў герояў, мастацкай адметнасці твора, яго значэння і ролі ў літаратурным працэсе. У 9 – 11 класах такія заняткі маюць месца пры вывучэнні буйнога эпічнага твора ці лірыкі паэта, вывучэнню якой быў адведзены шэраг урокаў. З 9 класа матэрыял вывучаецца манаграфічна, таму высновы павінны тычыцца індывідуальнай манеры аўтара, месца і значэння яго творчасці ў гісторыі літаратуры.

3 Кантрольныя. Задача – аб’ектыўна ацаніць веды вучняў.

<u>Віды кантролю</u>:

- індывідуальнае і франтальнае апытванне;
- напісанне сачыненняў, рэцэнзій, эсэ;
- тэставы кантроль, недахоп яго: магчымасць праверыць толькі рэпрадуктыўныя веды;

Ствараючы тэст, неабходна ўлічваць усе *віды заданняў*: заданні з выбарам аднаго ці некалькіх правільных адказаў; заданні па прынцыпу выключэння, на суадносіны ці парадак з’яў; тэсты адкрытага тыпу.

**Па прынцыпу выключэння:**

***Якія рысы <u>не ўласцівы</u> літаратуры Сярэднявечча?***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1. службова-прыкладное прызначэнне;
2. ананімнасць;
**3. свецкі характар;**
4. колькасная перавага перакладных твораў над арыгінальнымі.

**На парадак з'яў:**

**Вызначце храналагічны парадак падзей у біяграфіі Цёткі:**

а. шлюб са Стэпанасам Кайрысам;
б. выхад вершаваных зборнікаў "Скрыпка беларуская" і "Хрэст на свабоду";
в. праца фельчаркай у псіхіятрычнай лячэбніцы ў Нова-Вілейцы;
г. вучоба на філасофскім факультэце Львоўскага ўніверсітэта.

*Патрабаванні да тэстаў*: адсутнасць метафарычнасці, двухсэнсоўнасці, няяснасці, уключэнне непраўдападобных варыянтаў адказаў.

- літаратурная дыктоўка;
- размеркавальная дыктоўка;
- праца з перфакартамі;

4 камбінаваныя.

Як і пры правядзенні ўступных заняткаў, заключны этап патрабуе арганізацыі міні-свята, цікавых форм работы, багатага візуальнага раду.

**МПФ**: заключнае слова, параўнанне, дыдактычныя гульні эўрыстычнага характару, міні-алімпіяды, эўрыстычная гутарка, праблемныя сітуацыі, эпіграф, прыцягненне твораў сумежных відаў мастацтва і пазатэкставага матэрыялу (артыкулаў, мемуараў, інтэрв'ю і інш.), напісанне сачыненняў, эсэ, рэцэнзій, інсцэніраванне і мізансцэніраванне, работа з артыкулам падручніка, запіс вывадаў, конкурс чытальнікаў, групавыя формы работы, мастацкае расказванне, слоўнік афарызмаў, літаратурныя практыкаванні і інш.

**Выснова:** усе этапы вывучэння твора павінны быць прадуманы настаўнікам і лагічна звязаны паміж сабой. Толькі ў гэтым выпадку можна забяспечыць цэласнасць уражанняў і поглядаў на твор вучняў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ